Галоўны бухгалтар і праверка ведаў па пытаннях аховы працы

Даволі часта ў наймальнікаў выклікае цяжкасці пытанне аб неабходнасці праверкі ведаў па пытаннях аховы працы ў галоўнага бухгалтара.

У адпаведнасці з п. 38 Інструкцыі аб парадку навучання, стажыроўкі, інструктажу і праверкі ведаў работнікаў па пытаннях аховы працы, зацверджанай пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь 28.11.2008 № 175, кіраўнік арганізацыі на падставе Тыпавога пераліку кіраўнікоў і спецыялістаў, асобных катэгорый працуючых, якія павінны праходзіць праверку ведаў па пытаннях аховы працы, устаноўленага ў дадатку 6 да названай інструкцыі, сцвярджае адпаведны пералік.

Пасада «галоўны бухгалтар» згодна з п. 6 Агульных палажэнняў адзінага кваліфікацыйнага даведніка пасад служачых, зацверджаных пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь 02.01.2012 № 1, адносіцца да катэгорыі «кіраўнікі».

Улічваючы патрабаванні падпункта 1.1 пункта 1 Тыпавога пераліку, у выпадку, калі ў службовыя абавязкі галоўнага бухгалтара ўключаны пытанні аховы працы па адпаведных напрамках дзейнасці (напрыклад, правядзенне інструктажу па ахове працы з работнікамі, якія знаходзяцца ў непасрэдным падпарадкаванні, ажыццяўленне кантролю за выкананнем імі заканадаўства аб ахове працы і іншыя), то ён падлягае праверцы ведаў у аб'ёме патрабаванняў нарматыўных прававых актаў, тэхнічных нарматыўных прававых актаў, лакальных прававых актаў, захаванне якіх уваходзіць у яго абавязкі.

Начальнік Смаргонскага міжраённага
аддзела Гродзенскага абласнога ўпраўлення
Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы С.Ю.Шатохіна
08.06.2020